**Наталля Сцяжко**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

# ЭКРАННАЯ КУЛЬТУРА ЯК КРЫНІЦА ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫІ

«Слова можа забіць, слова можа адрадзіць», – гэта ісціна вядомая, асабліва вялікае значэнне ёй надаюць урачы пры гутарцы з пацыентамі. Таксама і выява – яна можа цешыць вока ці выклікаць нянавісць і агіду. Візуалізацыя слова ёсць прамое прызначэнне экраннай культуры, якая ўбірае ў сябе кіно і тэлебачанне. Наколькі таленавіта, якасна і прафесійна гэта будзе зроблена з боку аўтараў кіна- і тэлепраектаў, настолькі адпаведнымі эмоцыямі гэта адгукнецца ў душах гледачоў.

Недаацаніць ролю экраннай культуры сёння вельмі складана. Кіно было і застаецца ў гледачоў адным з самых любімых і папулярных відаў мастацтва, а тэлевізар, часам і не адзін, ёсць у кожнай сям’і. Нават калі чалавек не ходзіць ў кінатэатры, то гэты ж фільм, але з невялікім спазненнем, ён паглядзіць дома па тэлебачанні. DVD і камп’ютары яшчэ больш пашыраюць магчымасці чалавека, дазваляюць яму самому ажыццяўляць свой прагляд у зручны час. Такім чынам, асноўным сродкам знаёмства са светам, разумення свету і свайго месца ў ім становіцца экранная культура. Мы глядзім фільмы, знятыя ў розных краінах, і разумеем, як там жывуць людзі, якія праблемы іх хвалююць, але самае галоўнае – шукаем мадэлі паводзін, набіраемся вопыту і ведаў.

Экранізацыя літаратурных твораў, кіна- і тэлепадарожжы па лепшых музеях свету і архітэктурных аб’ектах дазваляюць чалавеку пранікнуць у сусветную скарбніцу культуры, не пакідаючы сцен сваёй кватэры ці роднага горада. Калі ўлічыць, што сёння маладое пакаленне, выхаванае на інтэрнэце, пачало чытаць значна меней, спадзеючыся на загрузку патрэбнага слова «клікам мышкі», замест пошуку патрэбнай інфармацыі ў бібліятэцы і поўнага прачытання кніг, то вельмі важна ствараць менавіта тыя экранныя творы, якія дапамагаюць выхоўваць густ і культуру.

Культура цэментуе нацыю, фарміруе народ. Калі мы з’ядданы, у нас агульныя інтарэсы, калі мы ганарымся сваёй гісторыяй, каранямі, тым, што сілкуе нас, выклікае вялікі гонар і веру ў сябе, мы здольныя пераадолець любыя выпрабаванні. Вопыт папярэдніх пакаленняў дапамагае набыць незвычайную моц і ўпэўненасць у сабе.

Зараз Беларусь перажывае няпросты перыяд, звязаны з эканамічнымі праблемамі. Наша краіна не першая і не апошняя апынулася ў такой сітуацыі. У Амерыцы ў 30-я гады мінулага стагоддзя вялікая амерыканская дэпрэсія вельмі балюча адбілася на лёсах мільёнаў чалавек. Цікава, але самы моцны ўплыў на жаданне выйсці з крызісу зрабіў кінематограф. Фільм «Знесеныя ветрам» стаў не толькі класікай сусветнага кінематографа, у якім распавядалася гісторыя станаўлення амерыканскага народа, але і гімнам свабодзе, моцы і веры ў сябе. Адбыўся перalom ментальнасці. З ныцця, адмоўнага настрою, размоў і думак пра тое, што ўсё дрэнна, людзі перапраграмавалі сябе на поспех і на ўпэўненасць ва ўласных сілах. Толькі сваёй працай мы здольныя змяніць свет да лепшага. Сіла мастацтва велізарная. І, можа, сёння, як ніколі, яму належыць вялікая роля.

Мастацтва і культура матывуюць чалавека на дабро і стварэнне. Таму сёння вельмі важна звярнуць увагу на кіно і тэлебачанне, якія здольныя ахапіць іншыя віды мастацтваў, пераасэнсаваць іх і данесці да гледача ў выглядзе фільмаў і тэлеперадач. Цыкл перадач «Альбарутэнія», «Лабірынты», «Эпоха» накіраваны на тое, каб абудзіць цікавасць да роднай зямлі, яе гісторыі і культуры. Пасля даволі вялікага перапынку ў беларускім кінематографе таксама зроблены крокі ў гэтым накірунку. Зняты фільмы «Анастасія Слуцкая», «Масакра», «Талаш», падрыхтаваны і гатовыя да запуску сцэнарыі «Еўфрасіння Полацкая», «Каласы пад сярпом тваім», «Шляхціч Завальня», «Янка Купала». Гэта што тычыцца нашай гісторыі і разумення месца беларуса ў агульнасусветным кантэксце. Такія сучасныя фільмы, як «Інсайт», «На спіне ў чорнага ката», «На раздарожжы», «Ціхі цэнтр», «Усё, што нам патрэбна», «Ваўкі», прапагандуюць агульначалавечыя каштоўнасці, душэўную чысціню і праблему выбару для чалавека. У будучым неабходна распрацоўваць гэтую лінію і ўзнімаць планку кінамовы, запрашаючы як мага больш таленавітых сцэнарыстаў і рэжысёраў да стварэння патрэбных карцін. Не баяцца рызыкаваць і ісці на эксперыменты.





Мастацтва і літаратура нязменна адлюстроўваюць культурна-гістарычныя рэаліі ў іх шматграннасці і багацці. Выдатная літаратура, добры сцэнарый даюць магчымасць для выяўлення этнакультурных асаблівасцей беларускага народа. Вырашэнне праблемы беларускай ідэі, беларускага шляху і, як вынік, нацыянальных інтарэсаў немагчыма без аналізу спецыфікі беларускага этнасу. Яго карані ляжаць у гісторыі, у паданнях, у творах літаратуры і мастацтва. Усё гэта трэба аналізаваць, асвятляць і даносіць да гледача праз культуралагічныя, адукацыйна-асветніцкія праграмы і дакументальныя фільмы на тэлебачанні, праз мастацкія стужкі. Таму так патрэбны і вельмі важны свой асабісты беларускі культуралагічны канал кшталту «Культура» ў Расіі.

У кожным этнасе ці народзе ёсць ядро, якім з’яўляецца этнічная самасвядомасць. Яна фарміруецца з мовы, фальклору, нормаў маралі, права, сістэмы каштоўнасцей. Мастацтва і культура перапрацоўваюць гэтую інфармацыю, кадзіруюць яе ў розных відах – жывапісе, музыцы, літаратуры – і пакідаюць нашчадкам. Экранная культура, прырода якой будуецца на ўсіх вышэйпералічаных складніках, здольная максімальна шырока распавядаць пра свой народ усяму свету, а ў кожнага жыхара сваёй краіны выклікаць гонар і павагу.

**Андрей Чупринский**
*Белорусская государственная академия искусств*

## ТЕЛЕВИДЕНИЕ В СОЦИОКУЛЬТУРНОМ КОНТЕКСТЕ

Современное телевидение, используя достижения новейших цифровых технологий, ускорило общемировой процесс глобализации, что привело в настоящее время и будет приводить в дальнейшем к разрушению традиционных форм коллективной